Хусаінаў І.Н. - ст.выкл.кафедры філасофіі і гісторыі БАТУ,

Шатэрнік Д.У. - выкл.кафедры філасофіі і гісторыі БАТУ

## ВЫХАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ СТУДЭНТАЎ

Прыярытэтным напрамкам пазааўдыторнай дзейнасці факультэта гуманітарызацыі Беларускага аграрнага тэхнічнага універсітэта з,яўляецца выхаванне патрыятызму, далучэнне да народных крыніц, нацыянальнай самапавазе да свайго народа. Нацыянальнаму самаўсвядамленню садзейнічае праца гурткоў этнаграфіі і гістарычнага краязнаўства.

У праграму гэтых гурткоў уваходзілі тэарэтычныя і практычныя заняткі, экскурсіі, пошуковыя экспедыцыі. Лекцыі суправаждаліся паказам слайдаў, відаматэрыялаў, што давала магчымасць, не выходзячы з аудыторыі, зрабіць падарожжы у розныя куткі Беларусі,пазнаеміцца з традыцыйнымі святамі нашага народа.

Вялікую ролю займаў збор гістарычных звестак з мясцін,адкуль паходзяць студэнты.Многія рэфераты напісаны студэнтамі на базе мясцовага матэрыяла /легенд,паданняў і інш./,які дагэтуль шырока невядомы і мае вялікую каштоўнасць.

Некаторыя пасяджэнні гурткоў адбываліся у музеях. Змястоўныя экскурсіі студэнты зрабілі у Заслаўскі гісторыка-археалагічны запаведнік,музей старажытнай беларускай культуры АН РБ, падарожжы па буйных гістарычных цэнтрах Беларусі-Міры,Нясвіжы, Мінска. Акрамя таго,на занятках студэнты прагледзелі некалькі слайдавых праграм па краязнаўству /"Камяні у культуры беларусаў","Архітэктура віленскага барока,"Вільня","Зямля Наваградская","Беларускія майстры у Маскве" і іншыя/.

Значнае месца у працы гурткоў адводзілася набыццю практычных навыкаў па методыцы збору этнаграфічных і краязнаўчых экспанатаў. За апошні год студэнты адшукалі больш за 200 каштоўных прадметаў. Земляробчыя прылады, прылады для збору ураджая,апрацоўкі дрэва ганчарныя і кавальскія вырабы,адзенне,посуд і іншыя рэчы склалі аснову экспазіцыі музея культуры і побыту беларускага сялянства. Пачынаючы працу па стварэнню музея,мы лічым,што яна будзе спрыяць успрыняццю ідэй Адраджэння.палітычнай і эканамічнай магутнасці Рэспублікі Беларусь.